**Смолік, А.І.**

# Увасабленне каляндарна-музычнага фальклору ў ігрышчах

Народная культура, па меркаванню сучасных беларускіх культуролагаў, уключае ў свой змест культурныя пласты розных эпох ад глыбокай старажытнасці да сённяшняга дня. Яна вызначае і нарміруе ўсе аспекты жыццядзейнасці этнаса: звычаі, абрады, уклад жыцця, формы гаспадарчай дзейнасці і інш. Традыцыйная народная культура аказала значны ўплыў і на фарміраванне фальклору як знакава-сімвалічнага выражэння традыцыі. Розныя віды і формы фальклору былі ўплецены ў тканіну народнай культуры, актыўна выкарыстоўваліся ў сацыякультурнай практыцы беларусаў, у тым ліку ў шматлікіх святах.

Шырока распаўсюджаным народным святкаваннем беларусаў у мінулых стагоддзях было ігрышча, якое зарадзілася яшчэ ў дахрысціянскі перыяд і працягвае бытаваць у адаптаваных да сучаных умоў формах. Яно з танцавальна-гульнявымі і тэатралізаванымі паказамі прымяркоўвалася да найважнейшых перыядаў у гадавым кругавароце дзён, звязаных з сонцастаяннем і раўнадзенствам. Менавіта пагэтаму ігрышчы ладзіліся часцей за ўсё зімой, вясной і летам (Каляды, Купалле, Маслянка, Радаўніца, сёмушна-русалныя і інш.). Пазней пад ігрышчам разумелі ўраджайныя святкаванні, вясковыя вечарыны шлюбна-эратычнага зместу, на якіх дэманстравыаліся пераапрананні, парадзіраваныя паказы вяселля, шлюбна-забаўляльныя і гульнявыя тэатралізацыі. Ігрышчы суправаджаліся народнымі песнямі, танцамі, інструментальнай музыкай, якія належалі да старажытнага пласта беларускага каляндарна-музычнага фальклору. Асабліва насычаны песенным, тэатральным і харэаграфічным фальклорам былі калядныя і купальскія ігрышчы.

Найбольш часта ў ігрышчах выкарыстоўвалася такая традыцыйная абрадава-гульнявая дзея, як “Жаніцьба Цярэшкі” [2, с. 254]. Тэатралізацыя абрада “Жаніцьба Цярэшкі” разыгрвалася ў перыяд зімовага сонцавароту і супадала з пераломнымі момантамі прыроднага і жыццёвага цыклу. Дзея абапіралася на карнавальную лексіку з уласцівай ёй логікай адваротнасці. Тэатралізацыя шлюбу суправаджалася жартоўнымі спаборніцтвамі хлопцаў і дзяўчат, дзе выразна ўвасоблена апазіцыя “мужчынскае – жаночае”. Дзея ўключала шэраг гульнявых этапаў, найбольш важнымі з якіх былі “перакручванне”, “пералоўліванне”, “застолле”. Усе этапы гульні функцыянальна і тэматычна звязваліся і афармляліся “цярэшкаўскімі” песнямі і танцамі. На апошнім “застольным” этапе “цярэшкаўскія” песні перапляталіся з living рознымі каляндарна-абрадавымі песнямі. Змест гульнявых песен раскрываўся праз адзінства трох кампанентаў: выразных сродкаў, музыкі і гульнявога дзеяння. Рухі спевакоў таксама звязаны з сюжэтам і уяўляюць сабой разыгрванне сітуацый, пра якія апавядаюць словы песні. Цярэшкаўскім песням уласцівы зычлівы гумар, крытычнае супастаўленне з’яў, прадметаў, характарыстыка персанажаў гульні праз абыгрванне працоўна-бытавых сітуацый і артыстычнае выяўленне чалавечай натуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На апошнім “застольным” этапе “цярэшкаўскія” песні перапляталіся з рознымі пазаабрадавымі песнямі і танцамі, якія нен дапасаваны да абрадаў каляндарнага і сямейна-родавага цыклаў. Аналіз … сведчыць, што часта выконваліся песні, у якіх былі ўвасоблены асноўныя сферы жыццядзейнасці чалавека, маральны і псіхалагічны вопыт беларускага этнаса. Гумарыстыка такіх народных песен, як “Перапёлачка”, “Падушачка”, “А мы проса сеялі”, “У нядзельку па абедзе”, “Як паехаў сын Даніла” і іншых вершаў-песен адметная сваёй дасціпнасцю, малюнкавасцю вобразаў, а часам і змяшчэннем паняццяў.

Традыцыйнай на ігрышчы была карагод-гульня “Яшчур”. З хлопцаў выбіраўся “яшчур”, які ставіўся ў цэнтар прасторы, дзе адбывалася ігрышча. Па правілах гульні дзяўчаты аддавалі “яшчуру” вянкі, хусткі, пярсцёнкі ці іншыя рэчы. Дзея суправаджалася адпаведнай песняй: “Сядзі, сядзі яшчур / У гайку зялёным, / У арэхавым кусце / На залатым крэсле”. Пасля кожная дзяўчына ўпрашвала “яшчура” вярнуць ёй яе рэч. Усе астатнія спявалі песню, якая функцыянальна была звязана з гэтым этапам гульні: “Пане яшчур, / адай мой вяночак! /Мой вяночак залаты, /Загубіла з галавы. /Будзе мяне мамка біць, /Ды некаму бараніць” [ ]. Хлопец вяртаў рэч, калі дзяўчына цалавала яго або выконвала якое-небудзь іншае пажаданне “яшчура”. Кампазіцыя, рытміка і памер песні адпавядаў гульнявой функцыянальнасці.

Вядомы беларускі фалькларыст А. Рыпінскі адзначаў, што на ігрышчах ладзілася таксама тэатралізаваная кампазіцыя “Ваджэнне казы”. Распаўсюджанай карнавальнай гульнёй беларускай моладзі яе называлі І. Эрэміч, А. Дамбавецкі. Падабенства “Казы” з маскараднымі паказамі адзначаў і П. Бяссонаў. У названай тэатралізаванай гульні спалучаліся песня, танец і дыялог. У гульні звычайна ўдзельнічалі 10-15 чалавек. Галоўным персанажам, безумоўна, была “каза”, ролю якой выконваў невысокі хлопец, здатны да танцаў і іправізацыі. Яго апраналі ў вывернуты кажух, на галаву адзявалі маску. Ролю “дзеда”, які вадзіў “казу”, выконваў высокі хлопец з развітым пачуццём гумару. Ён павінен быў муштраваць казу, падганяць кіям. “Каза” выконвала абрадавы танец: тупала, падскоквала, біла “дзеда” капытамі, бадала рагамі, клалася на падлогу, прыкідвалася памерлай. Дзея суправаджалася народнай песняйя, якую выконвалі песельнікі. Песня праслаўля становучыя якасці “казы”: “Дзе каза ходзіць, там жыта родзіць, / Дзе каза хвастом, там жыта кустом, / Дзе “каза” нагой, там жыта капой, / Дзе “каза” рогам, там жыта стогам, / Дзе каза не бывае, там жыта палягае” [2, с. 599]. Удзельнікі маскараднага паказу спрабавалі ажывіць “казу”, але беспаспяхова. Толькі пасля шчодрых падарункаў ад гаспадара “каза” ажывала. Песельнікі за гэта праслаўлялі яго. Выконвалі віншавальную песню з пажаданнем гаспадару добрага ўраджаю.

Акрамя гуртавых тэатральных паказаў на ігрышчах выконваліся народня танцы розных гісторыка-стылявых форм. Пашыранымі ў Беларусі былі парна-гуртавыя, парныя і солныя формы. Яны былі разнастайныя па кампазіцыі, мелілі ўстойлівую і імправізацыйную структуру (ад аднаматыўных да шматкаленных). Адметнасць шматкаленных танцаў выразна паказаў Я. Колас ў апавяданні “Ігрышча”. Паэт вельмі вобразна апісаў выкананне народнага танца “Каваля” двумя мужчынамі: То адзін, то другі / Плечуком ускіне, / Рукі іх – лук

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тугі, / I пастава іх нагі / У належным  чыне” [3, с. 101]. Колас называе шэраг іншых танцаў, якія моладзь выконвала падчас ігрышчаў: “Тут і вальсы, тут і полькі, / Гоман, жарты, смех і гук” [3, с. 100]. К. Тышкевіч у сваёй працы “Вілія і яе берагі” зафіксаваў яшчэ адзін народны танец “Мяцеліца”, якія выконваўся ў Х1Х ст. на Вілейшчыне ў час ігрышчаў: ”Скрыпкі пранізліва запішчалі вясёлую мяцеліцу, і нейкі малады хлопец з натоўпу схапіў маладую і прыгожую дзяўчыну і пачаў хутка круціць, за ім пайшоў другі, трэцці, з-за недахопу хлопцаў дзяўчаты пайшлі танцаваць парамі. Усе панесліся ў танец, са смехам і крыкам, як звычайна ў танцы і бывае, весела па карчме круціліся да змору і знямогі” [6, с.415].

Я. Колас і К. Тышкевіч зафіксавалі той факт, што выкананне песен і танцаў на ігрышчах адбывалася пад акампанімент музычных інструментальных ансамблеў, у склад якіх уваходзіла некалькі народных музычных інструментаў. Я. Колас у сваім апавяданні апісаў ансамбль з трох відаў народных інструментаў: “Скрыпка ж голасна звініць, / Ну, дзівота, як жывая, / От, здаецца, гаманіць…” [с. 98]. “I басэтля безупынку / Ўсё раве і ўсё раве…” [3, с. 98]. “Рэпіць дудка, не даецца, /Адатне ды зноў пачне” [3, с. 99]. Архіўныя дакументы сведчаць, што ў карчме мястэчка Краснае (Маладзечненскі раён) у ХУ111 ст. часта ігралі музыкі-віртуозы Васіль Карчміт і Паўлюк Ламінскі, якія пазней былі нават запрошаны ў славутую капэлу Антонія Тызенгаўза, у Гародню, дзе давалі сольныя канцэрты на скрыпцы, басэтлі, клавесіне [5, с. 47]. Незвычайны талент вясковага музыкі самародка раскрыў Колас у паэме “Сымон-музыка”. Наведвальнікі карчмы “выхвалялі яго ўсяк: / Чый ён, жэўжык? Ось музыка! / Ось, псякроў яго, мастак! —“ [4, с. 372].

Надзвычай вялікая ўвага надавалася падчас  ігрышча  выбару прасторы, у якой яно адбывалася. Месцам правядзення яго маглі служыць хата, луг, двор, лес і інш. Аналіз навуковай і мастацкай літаратуры дае падставу сцвярджаць, што ігрышчы часцей за ўсё ладзіліся ў корчмах, якіх у Беларусі ў мінулых стагоддзях было шмат. Так, толькі ў мястэчку Лебедзева (цяпер Маладзечненскі раён) у ХУ11 ст. на 149 двароў прыходзілася 48 корчмаў і заезных дамоў. У сярэдзіне Х1Х ст. у г. Вілейцы на 2719 жыхароў прыходзілася 10 корчмаў і 1 вінны склеп [5, с.48]. У пачатку ХХ ст. 25 корчмаў налічвалася ў Полацку[1, с. 24]. Я. Колас у паэме “Сымон-музыка”, апавяданні “Ігрышча” адзначаў, што ў карчме моладзь ладзіла масавыя святочныя гулянні-ігрышчы . “Тут ігрышчы адбываліcь / Перад святамі зімой. / Танцавалі маладыя, / Весяліліся, пілі, / Для іх скокі, гульні тыя / Многа радасці ням/слі” [4, с. 373].

Такім чынам, даследванне функцый беларускай карчмы дазваляе меркаваць, што яна прадстаўляла асобе магчымасць задаволіць патрэбнасці ў самарэалізацыі, самавыражэнні яе здольнасцей, індывідуальнасці, думак і пачуццяў у творчасці з выкарастаннем песенных, музычна-харэаграфічных, абрадых дзействаў і гульні. Самарэалізацыя свайго ўнутранага, індывідуальна непаўторнага “Я” ажыццяўлялася ў асноўным у калектыўных формах, дзе ўдзел асобнага індывіда як бы зліваўся ў адзіны працэс і вынік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура

1. Даражкоўскі, С.Л. Аб’екты грамадскага харчавання ў гарадской інфраструктуры Полацка канца Х1Х – пачатку ХХ стст. / С.Л. Даражкоўскі // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі: (па выніках навукова-даследчай работы ў 2007 г.) / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк: НПГКМЗ, 2008. – 120 с.: іл.
2. Ігрышча // Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2 т. Т. 1: Акапэла – Куцця /Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш.—Мн.: БелЭн, 2005.—768 с.: іл
3. Колас, Я. Збор. твораў: у 14 т. Том 3. Апавяданні вершам, вершы, вершаваныя казкі, паэмы для дзяцей і народныя казкі ў апрацоўцы Я. Коласа / Я. Колас. – Мн.: ” Маст. літ.”, 1973.– 408 с. з іл.
4. Колас, Я. Збор твораў: у 14 т. Том 6. Паэмы “Новая зямля, “Сымон- музыка “ / Я. Колас. – Мн.: ” Маст. літ.”, 1974. – 624 с. з іл.
5. Костенко, В.М., Михалевич, М.М. Корчмы в книге К. Тышкевича “Вилия и ее берега” / В.М. Костенко, М.М. Михалевич // Другия Тышкевіцкія чытанні (г. Лагойск, 15 кастрычніка 2009г.): матеріалы чытанняў / рэдал.: А.І. Смолік (адк. рэд.) і інш.—Мн.: Бел. Дзярж. Ун-т культуры і мастацтваў, 2009.—109 с.
6.Tyszkewicz, K. Wilija i jej brzegi / K. Tyszkewicz.—Drezno, 1871. – 657 с.

*А.І. Смолік, доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі БДУ культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ